MOST

Кіраўніцтва па падачы заявак
EU4Belarus:

# ПРАГРАМА МАБІЛЬНАСЦІ ДЛЯ МЭТАВЫХ КАНТАКТАЎ ПАМІЖ ЛЮДЗЬМІ МОСТ+

Фінансуецца Еўрапейскім Саюзам

GOETHE INSTITUT Рэалізуецца Гётэ-Інстытутам

## Аб праграме MOST+

MOST+ – гэта праграма спрыяння прафесійнаму абмену паміж беларускімі прафесіяналам і іх калегамі з ЕС. Праект MOST+ будзе садзейнічаць развіццю мабільнасці і інтэрнацыяналізацыі беларускіх спецыялістаў і дапаможа ім інтэгравацца ў агульнаеўрапейскія прафесійныя супольнасці.  Для выканання гэтых мэт праект MOST+ будзе арыентавацца на стварэнне ўстойлівых кантактаў, развіццё плённага абмену вопытам і ведамі паміж прафесіяналамі з Беларусі і краінаў-членаў Еўрапейскага Саюза, а таксама на прымяненне еўрапейскіх найлепшых практык і іншых фактараў поспеху ў розных сферах у Рэспубліцы Беларусь.

Праект MOST+ з'яўляецца пераемнікам праектаў MOST I і MOST II, якія з 2015 па 2020 год забяспечылі індывідуальную мабільнасць для 4873 беларускіх спецыялістаў.

Праграма мабільнасці MOST+ дае беларускім спецыялістам яшчэ адну магчымасць для ўдзелу ў стажыроўках і іншых праектах мабільнасці. Перыяд рэалізацыі праграмы - з лістапада 2022 па ліпень 2024 года.

## Якія сферы прафесійнай дзейнасці ахоплівае праграма MOST+?

Заяўку на атрыманне гранта могуць падаць спецыялісты, якія працуюць у наступных шасці сферах:

- Грамадства (грамадзянская супольнасць, правы чалавека і СМІ)
- Культура (у шырокім разуменні, у тым ліку турызм, культурныя і крэатыўныя індустрыі)
- Бізнэс (малы і сярэдні бізнэс, інавацыйны бізнэс, у тым ліку IT)
- Адукацыя (пазафармальная і неакадэмічная, уключаючы бесперапынную адукацыю на працягу ўсяго жыцця)
- Ахова здароўя
- Устойлівасць (арганічнае земляробства, абарона навакольнага асяроддзя, устойлівая энергетыка)

## Хто можа падаваць заяўкі?

Вы павінны быць грамадзянінам Рэспублікі Беларусь ва ўзросце ад 18 гадоў.

Вы павінны быць спецыялістам, які працуе ў адной з шасці пералічаных вышэй абласцей. Не прымаюцца заяўкі ад заяўнікоў, якія займаюцца названай дзейнасцю у якасці хобі.
Не прымаюцца заяўкі ад студэнтаў, якія яшчэ не скончылі навучанне і не атрымалі прафесію.

Вы можаце падаць заяўку індывідуальна ці ў складзе групы да пяці заяўнікоў.

Вашай краінай пражывання можа быць Беларусь ці любая іншая краіна. Краіна пражывання - гэта краіна, якую заяўнік лічыць краінай свайго сталага жыхарства.

Не прымаюцца заяўкі ад фізічных асоб і супрацоўнікаў устаноў, якія падпадаюць пад рашэнні Савета міністраў замежных спраў ЕС датычна Рэспублікі Беларусь і пад адпаведныя санкцыі, накладзеныя на фізічных асоб і арганізацыі.

## Якія паездкі падтрымліваюцца праграмай MOST+?

З дапамогай гранта на забеспячэнне мабільнасці вы можаце наведаць краіны ЕС з мэтай:

- Усталяваць партнёрскія адносіны ў сваёй прафесійнай сферы і пашырыць свае міжнародныя прафесійныя кантакты
- Распрацаваць сумесныя праекты
- Паўдзельнічаць у канферэнцыях, кангрэсах, форумах, міжнародных мерапрыемствах, іншых галіновых мерапрыемствах
- Паўдзельнічаць у вучэбна-азнаямленчых паездках і візітах па абмене досведам
- Прыняць удзел у стажыроўцы.

Ваша паездка павінна быць непасрэдна звязана са сферай вашай прафесійнай дзейнасці.

Ваша паездка павінна садзейнічаць прафесійнаму росту. Удзел павінен быць актыўным (напрыклад, прэзентацыя, а не проста ўдзел у мерапрыемстве).

Вашая паездка павінна прынесці карысць і стаць крыніцай інфармацыі для іншых беларускіх спецыялістаў з вашай сферы.

### Якія магчымы фарматы і працягласць паездак ?

Вы можаце падаваць заяўкі ў пяці катэгорыях, у залежнасці ад працягласці і фармату запланаванай паездкі (уключаючы час у дарозе):

- Катэгорыя 1 / Кароткатэрміновыя паездкі: вучэбна-азнаямленчыя паездкі, паездкі для абмену досведам, удзел у міжнародных мерапрыемствах, наладжванне сувязей і інш., ад 3 да 7 дзён.
- Катэгорыя 2 / Доўгатэрміновыя паездкі: стажыроўка ад 14 да 30 дзён.
- Катэгорыя 3 / Шматэтапная мабільнасць: мабільнасць у некалькі краін ці некалькі этапаў: ад 6 да 21 дня.
- Катэгорыя 4 / Візіт еўрапейскіх партнёраў: візіты працягласцю ад 3 да 6 дзён.

- Катэгорыя 5 / Анлайн-мабільнасць: удзел у прафесійных мерапрыемствах у рэжыме анлайн.

**Кароткатэрміновыя паездкі** ў асноўным прызначаны для ўдзелу ў канферэнцыях і семінарах.
Дазваляюць наладжваць кантакты з іншымі спецыялістамі, якія працуюць у адпаведнай галіне, а таксама атрымліваць водгукі аб уласных даследчых праектах або іншую актуальную інфармацыю.
**Доўгатэрміновыя паездкі** дазваляюць зацікаўленым удзельнікам глыбей і больш інтэнсіўна вывучыць пэўную тэму і, магчыма, папрацаваць над канкрэтным праектам.
**Шматэтапная мабільнасць** дазваляе ўдзельнікам наведаць да 3 розных краін ЕС. Паездкі ў некалькі краін або паездкі, арганізаваныя ў некалькі этапаў, дазваляюць удзельнікам карыстацца прафесійным абменам на працягу больш працяглага перыяду, не пакідаючы надоўга месца працы. У самым пачатку неабходна будзе скласці план працы і сфармуляваць прамежкавыя мэты.
**Візіты еўрапейскіх партнёраў** даюць партнёрам з краін ЕС магчымасць зноў сустрэцца са сваімі беларускімі калегамі ў іх на радзіме ці ў краіне іх пражывання. Гэта дазволіць еўрапейскім партнёрам не толькі атрымаць яснае ўяўленне аб працы калег, але і паглыбіць наладжаныя падчас паездкі кантакты і супрацоўніцтвы, а таксама сфарміраваць устойлівыя прафесійныя сувязі.
**Анлайн-мабільнасць** не прадугледжвае паездак, але дазваляе прыняць удзел у рэжыме анлайн у мерапрыемствах, якія праходзяць або арганізуюцца ў краінах ЕС. Гэтая катэгорыя пакрывае толькі аплату рэгістрацыйных унёскаў.

## Калі пачнуцца паездкі, якія іх тэрміны?

Ад 3 да 30 дзён (улічваючы час у дарозе).
Аб'яўляецца бесперапынны прыём заявак на праекты забеспячэння мабільнасці, без прамежкавых тэрмінаў для падачы заявак.

| | Дата |
|---|---|
| Пачатак прыёму заявак | Лістапад 2022 г. |
| Самая ранняя магчымая дата пачатку праектаў мабільнасці | 1 студзеня 2023 г. |
| Апошняя магчымая дата пачатку праектаў мабільнасці | 15 ліпеня 2024 г. |
| Апошні тэрмін падачы заявак | 3 чэрвеня 2024 г. (15:00 па беларускім часе) |
| Анлайн-кансультацыя для заяўнікоў (выкарыстоўвайце гэту форму для рэгістрацыі). Рэгістрацыя адкрыта да 20 снежня 2022г., 15:00 па беларускім часе. | 20 снежня 2022 г., (19:00 па беларускім часе) |

Улічваючы працэс ацэнкі заявак (да аднаго месяца) і час, неабходны для заключэння кантрактаў, пераводу сродкаў і арганізацыі паездак (некалькі тыдняў), заяўкі трэба

падаваць як мінімум за 2 месяцы да запланаванага пачатку праекта мабільнасці (за 3 месяцы ў выпадках, калі патрэбна віза).

Вы можаце прыступаць да рэалізацыі вашага праекта мабільнасці ТОЛЬКІ ПАСЛЯ падпісання пагаднення аб прадастаўленні гранта!

## Якія краіны можна наведваць?

Мэтавымі краінамі праграмы MOST+ з'яўляюцца краіны Еўрапейскага Саюза: Аўстрыя, Бельгія, Балгарыя, Венгрыя, Германія, Грэцыя, Данія, Ірландыя, Іспанія, Італія, Кіпр, Латвія, Літва, Люксембург, Мальта, Нідэрланды, Польшча, Партугалія, Румынія, Славакія, Славенія, Фінляндыя, Францыя, Харватыя, Чэхія і Швецыя.

## Карысна ведаць

- Па праграме мабільнасці MOST+ вы можаце прыняць удзел у максімум двух праектах мабільнасці (і толькі ў адным праекце мабільнасці, калі раней вы ўжо ўдзельнічалі ў праекце MOST I і II).
- У выпадку адхілення вашай заяўкі вы можаце падаць заяўку на іншы праект мабільнасці
- Адначасова можна падаць толькі адну заяўку. Пасля атрымання вынікаў ацэнкі адной заяўкі вы можаце зноў падаць заяўку на іншы праект мабільнасці.

## Хто рыхтуе маю паездку?

Заяўнік самастойна рыхтуе сваю паездку:

- Устанаўлівае кантакты і заключае неабходныя дамоўленасці з прымаючым бокам/партнёрамі ў краіне ЕС (да 10 арганізацый на адзін праект мабільнасці).
- Распрацоўвае, плануе, арганізоўвае перамяшчэнне і дзейнасць у паездцы.

Заяўнік нясе адказнасць за атрыманне віз і іншых неабходных для паездкі дакументаў (напрыклад, пашпарт, страхаванне здароўя, медыцынскія тэсты). Заяўнікам рэкамендуецца загадзя прыняць усе неабходныя меры для атрымання візы (віз). Пры неабходнасці праект MOST+ можа выдаць пісьмовае пацверджанне, на падставе якога удзельнік праекта звернецца па візу. Памятайце, што для разгляду такога запыту патрабуецца не менш за пяць працоўных дзён.

## Якія выдаткі фінансуе грант на забеспячэнне мабільнасьці?

- Выдаткі на замежныя паездкі (квіткі на аўтобус/цягнік/самалёт - набывае праграма MOST+ пасля ўзгаднення з атрымальнікам гранта)
- Паездкі ўнутры краіны прызначэння (толькі эканом-класам, паездкі ў першым класе ці бізнес-класе не пакрываюцца)
- Пражыванне, харчаванне і мясцовыя пераезды (у адпаведнасці з установленай ЕС сутачнай стаўкай для краіны прызначэння ). Разлік колькасці сутак праводзіцца ў адпаведнасці з правіламі ЕС. Для праектаў мабільнасці з працягласцю знаходжання больш за 14 сутак у адной краіне сутачныя разлічваюцца наступным чынам: установленая ЕС сутачная стаўка для краіны х 0,66 (мяркуецца, што ўдзельнікі доўгатэрміновых паездак змогуць арганізаваць для сябе эканомнае пражыванне).
- Рэгістрацыйныя ўнёскі (напрыклад, унёскі за ўдзел у канферэнцыях ці іншых мерапрыемствах)
- Візавыя зборы (калі патрабуецца)
- Страхаванне здароўя (не патрабуецца, калі ва ўдзельніка ўжо ёсць страхоўка)
- Страхаванне паездак (для адмены або замены квіткоў)
- Іншыя выдаткі, непасрэдна звязаныя з паездкай
- Калі ў вас ёсць інваліднасць або асаблівыя патрэбнасці (напрыклад, дадатковы багаж з матэрыяламі, патрэбнымі для дасягнення мэт вашай паездкі), вы можаце атрымаць дадатковае фінансаванне, якое пакрывае выдаткі на задавальненне вашых асаблівых патрэбаў. Спіс дадатковых выдаткаў і іх апісанне павінен быць уключаны ў бюджэт паездкі.

Важная інфармацыя: атрымальнікі гранта самі адказваюць за аплату падаткаў, звязаных з атрыманнем гранта.

## Якія выдаткі не фінансуюцца грантам?

- Выдаткі, не ўказаныя ў прыкладзеным да заяўкі бюджэце паездкі
- Выдаткі, якія не маюць прамой сувязі з паездкай (падарункі, арганізацыя вольнага часу і да т.п.)
- Выдаткі, ужо пакрытыя іншымі грантамі і праграмамі
- Выдаткі, панесеныя да падпісання пагаднення аб прадастаўленні гранта
- Выдаткі на паездкі, якія ўжо адбыліся.

## Як падаць заяўку на грант?

Вы павінны падаць заяўку на грант на забеспячэнне мабільнасці праз анлайн-платформу MOST+ на партале падачы заявак Гётэ-Інстытута (GAP) https://gap-online.goethe.de/. Неабходныя суправаджальныя дакументы:

Дадатак 1 "Запрашэнне ад прымаючай арганізацыі, праграма канферэнцыі або іншае пацвярджэнне наяўнасці праграмы паздкі" (па адным запрашэнні ад кожнай прымаючай арганізацыі);
Дадатак 2 «Рэзюмэ» – скарыстайцеся гэтым узорам ;
Дадатак 3 «Дазвол выплачваць грант на забеспячэнне мабільнасці па праграме MOST+ трэцім асобам» (калі патрабуецца, скарыстайцеся гэтым узорам).

## На якой мове падаецца заяўка

Заяўку, суправаджальныя дакументы і справаздачы можна падаваць на англійскай, расейскай ці беларускай мовах. Кіраўніцтва па падачы заявак таксама дасяжнае на трох мовах.

## Тэхнічная інфармацыя аб запаўненні электроннай заяўкі

- Спачатку неабходна зарэгістравацца на партале GAP.
- Для рэгістрацыі на партале GAP спатрэбіцца адрас вашай электроннай пошты. Ён стане афіцыйным каналам сувязі з вамі, таму рэгулярна правярайце ўказаную пры рэгістрацыі электронную пошту.
- На ўсіх укладках ёсць абавязковыя і неабавязковыя палі, абавязковыя палі адзначаны зорачкай. Вы не зможаце падаць заяўку, пакуль не будуць запоўненыя ўсе абавязковыя палі.
- Электронная заяўка можа быць запоўнена на англійскай, рускай ці беларускай мовах (запоўненыя на іншых мовах электронныя заяўкі не разглядаюцца).
- Выканаўшы ўсе этапы і ўказаўшы абавязковыя звесткі, вы можаце падаць заяўку, для гэтага выкарыстоўвайце кнопку «Захаваць і адправіць». Пасля падачы заяўка накіроўваецца на разгляд. Пасля гэтага вы больш не зможаце змяняць заяўку ці загружаць файлы.
- Калі вы не атрымаеце аўтаматычнае пацверджанне аб тым, што заяўка пададзена, звяжыцеся з намі па электроннай пошце: infomobility@goethe.de
- Абавязкова падавайце заяўку загадзя, паколькі адказныя за ацэнку спецыялісты могуць быць перагружаныя.

## Якая інфармацыя ўказваецца ў электроннай заяўцы?

| Адкрыты прыём заявак па праграме мабільнасці MOST+<br>(уся інфармацыя прадастаўляецца на англійскай, рускай або беларускай мове) |
|---|
| Укажыце вашу прафесійную сферу (з шасці прапанаваных у рамках праграмы мабільнасці) |

| |
|---|
| Персанальныя дадзеныя (укладка "Details" ("Звесткі")) |
| • Прозвішча, імя (напісанне лацінскімі літарамі як у пашпарце)<br>• Пол<br>• Узрост (абраць узроставую катэгорыю)<br>• Грамадзянства<br>• Краіна пражывання<br>• Паштовы адрас<br>• Электронная пошта<br>• Нумар тэлефона<br>• Звесткі аб месцы працы заяўніка |
| Падрабязныя звесткі аб неабходнай вам мабільнасці (укладка «Criteria» («Крытэрыі»)) |
| Мэта мабільнасці:<br>• Устанаўленне партнёрскіх адносін у сваёй прафесійнай сферы<br>• Пашырэнне міжнародных прафесійных кантактаў<br>• Прасоўванне прадукту сваёй працы ці сваёй паслугі<br>• Распрацоўка сумесных праектаў |
| Тып вашай мабільнасці:<br>• Удзел у канферэнцыях, кангрэсах, форумах, міжнародных мерапрыемствах, іншых галіновых мерапрыемствах<br>• Азнаямленчая паездка або паездка для абмену вопытам<br>• Стажыроўка<br>• Паездкі ў некалькі краін і/ці паездкі, арганізаваныя ў некалькі этапаў<br>• Візіт еўрапейскіх  парнёраў<br>• Анлайн-мабільнасць |
| Тэрмін дзеяння мабільнасці<br>• Дата пачатку<br>• Дата заканчэння |
| Краіна (краіны) прызначэння: спіс з 27 краін ЕС плюс Рэспубліка Беларусь (выбар да 3 краін ЕС) |
| Звесткі аб прымаючым баку/партнёры (кантактная інфармацыя і абгрунтаванне выбару прымаючага боку/партнёра, да 10 розных арганізацый на адзін праект мабільнасці) |
| Падрабязнае апісанне мабільнасці, у тым ліку план дзейнасці і запланаваныя вынікі (максімальная колькасць знакаў: 4000 разам з прабеламі) |
| Прафесійная значнасць мабільнасці (мэты і дадатковая вартасць мабільнасці для вашай прафесійнай дзейнасці і вашага кар'ернага плана) |
| Дадатковая вартасць мабільнасці для вашай прафесійнай супольнасці (як вы плануеце дзяліцца атрыманым у паездцы досведам) |
| Доўгатэрміновыя вынікі вашай мабільнасці |
| Ваш узровень валодання мовай краіны, якую вы выбралі для мабільнасці / як вы плануеце арганізаваць камунікацыю з прымаючым бокам / партнёрам (-амі)? |
| Выдаткі на праект (скарыстайцеся гэтым узорам бюджэту) |
| Дакументы, якія неабходна загрузіць на партал GAP разам з вашай заяўкай (укладка «Attachment» («Дадатак»)) |

| |
|---|
| Пацвярджэнне ад прымаючай арганізацыі з ЕС аб тым, што яна гатова прыняць вас (напрыклад, звычайны або электронны ліст або іншы афіцыйны дакумент, які пацвярджае, што партнёр/прымаючая арганізацыя згодны прыняць вас у рамках вашай мабільнасці, па адным ад кожнай прымаючай арганізацыі) |
| Рэзюмэ. Для састаўлення вашага рэзюмэ мы просім вас выкарыстоўваць гэты ўзор рэзюмэ. Гэты стандарт дапаможа вам структураваць інфармацыю і прэзентаваць яе ў максімальна яснай і даступнай форме. Дзякуючы гэтаму эксперты змогуць даць справядлівую і аб'ектыўную ацэнку вашай заяўкі. У выпадку групавых заявак падаецца рэзюмэ ад кожнага ўдзельніка. |

## Ацэнка

Ваша заяўка пройдзе некалькі этапаў ацэнкі. Першая ацэнка дазваляе праверыць адпаведнасць вашай заяўкі тэхнічным крытэрам:

- Адпаведнасць заяўніка, краіны прызначэння, тыпу мабільнасці ўказаным крытэрам;
- Правільнасць запаўнення формы заяўкі і наяўнасць усіх неабходных дакументаў.

Калі ваша заяўка адпавядае тэхнічным крытэрам, яна будзе перададзена на разгляд двум незалежным экспертам, якія спецыялізуюцца ў вашай вобласці. Яны ацэняць заяўку па зацверджаных крытэрыях адбору. У выпадках, калі адзнакі экспертаў будуць разыходзіцца на 35% ці больш, да разгляду будзе прыцягнуты трэці эксперт.

Прыкладна праз адзін месяц з моманту падачы заяўкі вы атрымаеце па пошце апавяшчэнне аб выніках яе разгляду.

| Асноўныя крытэрыі адбору | |
|---|---|
| Прафесійная значнасць мабільнасці | • Наколькі поўна заяўка апісвае асабістую і прафесійную матывацыю заяўніка?<br>• Наколькі пераканаўча апісана мэта запланаванай мабільнасці?<br>• Ці мае мабільнасць дадатковую вартасць для прафесійнага росту заяўніка?<br>• Ці існуе прамая сувязь паміж мабільнасцю і вобласцю прафесійнай дзейнасці заяўніка?<br>• Ці рэлевантна прапанаваная мабільнасць для прафесійнай дзейнасці заяўніка з улікам дадзеных, указаных у яго (яе) рэзюмэ |
| Мэтазгоднасць і рэалістычнасць мабільнасці | • Наколькі добра апісана прапанаваная мабільнасць? Наколькі лёгка можна зразумець ключавыя аспекты мабільнасці? |

| | |
|---|---|
| | • Ці адпавядаюць краіна прызначэння і прымаючы бок/партнёр(ы) заяўленым мэтам мабільнасці? Наколькі яны рэлевантныя ў кантэксце дадзенай мабільнасці?<br>• Наколькі добра спланавана і арганізавана дзейнасць у рамках мабільнасці?<br>• Ці адпавядаюць запланаваныя выдаткі актыўнасцям у рамках мабільнасці?<br>• Ці зможа заяўнік эфектыўна камунікаваць з прымаючай арганізацыяй/партнёрам? Ці існуе магчымасць пераадолець патэнцыйныя моўныя бар'еры? |
| Рэзанансны эфект мабільнасці | • Ці мае мабільнасць дадатковую вартасць для беларускіх калег / прафесійнай супольнасці заяўніка?<br>• Ці апісаў заяўнік, як ён (яна) плануе дзяліцца вынікамі мабільнасці з іншымі беларускімі спецыялістамі? |
| Доўгатэрміновыя вынікі / устойлівасць | • Як заяўнік плануе выкарыстоўваць вынікі мабільнасці ў доўгатэрміновай перспектыве? |
| Адпаведнасць мэтам / каштоўнасцям праекта | • Наколькі прапанаваная мабільнасць адпавядае мэтам і каштоўнасцям праграмы MOST+? |
| Дадатковыя крытэры адбору | |
| Геаграфія і статут | • Ці з'яўляецца заяўнік міжнародна перамешчанай асобай або падвяргаўся(-лася) палітычным рэпрэсіям?<br>• Ці пражывае заяўнік у сельскай мясцовасці, маленькім горадзе ці ў рэгіёне з дрэннай інфраструктурай? |
| Менш запатрабаваныя краіны | • Ці ўваходзіць выбраная заяўнікам краіна прызначэння ў наступны спіс: Бельгія, Балгарыя, Кіпр, Данія, Эстонія, Фінляндыя, Грэцыя, Венгрыя, Ірландыя, Люксембург, Мальта, Славакія, Славенія, Румынія? |
| Удзел у папярэдніх праграмах MOST | • Ці рэалізаваў заяўнік як мінімум 2 праекты мабільнасці па праграме MOST+?<br>• Ці рэалізаваў заяўнік у мінулым праект мабільнасці ў межах MOST I ці II і 1 праект мабільнасці па праграме MOST+?<br>• Перавага аддаецца заяўнікам, якія раней не ўдзельнічалі ў праграмах мабільнасці MOST I, II або MOST + |
| Адсутнасць роўных умоў | • Ці падвяргаўся заяўнік дыскрымінацыі або несправядліваму абыходжанню? |

## Як адбываецца выплата гранта?

У выпадку адабрэння заяўкі з вамі будзе падпісана пагадненне аб прадастаўленні гранта праграмай MOST+. Пагадненне аб прадастаўленні гранта ўстанаўлівае правы і абавязкі грантаў і праграмы MOST+, а таксама ўключае падрабязныя ўмовы прадастаўлення гранта, у тым ліку інфармацыю аб выплаце гранта, парадак пералічэння сродкаў і патрабаванні да справаздач.

Звярніце ўвагу: плацяжы ажыццяўляюцца ў еўра шляхам банкаўскага пераводу. Любыя банкаўскія зборы аплачваюцца атрымальнікам. Прадугледжана магчымасць выплаты гранта на мабільнасць трэцім асобам, якія маюць банкаўскі рахунак у еўра. Такая выплата адбываецца пад адказнасць заяўніка пры ўмове падпісання дазволу. У пэўных выпадках выплата гранта праводзіцца наяўнымі ў еўра (напрыклад, рэзідэнтам Беларусі, якія едуць праз Вільню).

Пасля падпісання пагаднення аб прадастаўленні гранта 80% сумы гранта выплачваецца на тое, каб пачаць рэалізацыю праекта мабільнасці. Астатнія 20% выплачваюцца пасля падачы справаздачы аб праекце мабільнасці і яе зацвярджэння праектнай групай.

У выпадку невыканання ўмоў прадастаўлення гранта і патрабаванняў, выкладзеных у пагадненні аб прадастаўленні гранта, вы павінны будзеце вярнуць грант праграме MOST+.

## Справаздачы

Атрымальнікі абавязваюцца на працягу аднаго месяца з моманту завяршэння праекта прадставіць справаздачу з апісаннем дзейнасці і фінансавую справаздачу разам з усімі фінансавымі дакументамі. Астатак сумы фінансавання (20%) будзе выплачаны пасля падачы і зацвярджэння справаздачы.
Структура справаздачы:
1) Тэкставая справаздача:
- Апісанне рэалізаванай дзейнасці і дасягнутых вынікаў;
- Дадаткі: тэкст прэзентацыі, прадстаўленай на міжнародным мерапрыемстве; мінімум 3 фатаграфіі, якія паказваюць дзейнасць па праекце мабільнасці, фатаграфіі візітных картак новых партнёраў з ЕС. Па магчымасці: відэа і пасты ў сацыяльных сетках, дэманструючыя дзейнасць падчас праекту.
2) Фінансавая справаздача:
Форма з фактычна панесенымі выдаткамі і прымацаванымі пацвярджальнымі дакументамі:
- Доказы выдаткаў (рахункі, пацверджанні аплаты; напрыклад, за ўдзел у канферэнцыі);
- Доказ таго, што паездка адбылася і доўжылася запланаваную колькасць дзён (напрыклад, пасадачныя талоны, білеты на транспарт, штампы ў пашпарце, мясцовыя квітанцыі або рахункі ў краіне прызначэння з указаннем вашага імені).
3) Другая тэкставая справаздача:
Запаўняецца праз 6 месяцаў пасля паездкі і дапаўняе першую справаздачу. У ёй удзельнікі праекта прадастаўляюць абноўленую інфармацыю аб тым, чаго ім удалося дасягнуць у выніку паездкі і наколькі ўстойлівымі аказаліся кантакты з новымі партнёрамі.

Узоры тэкставых і фінансавых справаздач прадастаўляюцца пры падпісанні пагаднення аб прадастаўленні гранта.

## Абарона асабістых дадзеных

Падаючы заяўку на атрыманне гранта, вы згаджаецеся на апрацоўку вашых асабістых дадзеных у адпаведнасці з Агульным рэгламентам абароны асабістых дадзеных Еўрапейскага Саюза GDPR, дэкларацыяй Гётэ-Інстытута аб абароне дадзеных і законамі Федэратыўнай Рэспублікі Германія аб абароне асабістых дадзеных (дэкларацыя аб абароне дадзеных таксама ўключана ў форму заяўкі).

## Кантакты

Пытанні датычна праграмы мабільнасці накіроўвайце па электроннай пошце: infomobility@goethe.de